**Доўнар, А.Б. Сістэма аховы правапарадку на тэрыторыі Беларусі ў XVI–XVIII стст. / А.Б. Доўнар // Милиции Беларуси 90 лет: история и современность: материалы науч.-практ. конф. (Минск, 27 февр. 2007 г.) / [редкол.: К.И. Барвинок (отв. ред.) и др.]. – Мн.: Академия МВД Республики Беларусь, 2007. - С. 66-74.**

У XVI–XVIII стст. беларускія землі ўваходзілі ў Вялікае княства Літоўскае (ВКЛ) і былі яго паўнапраўнай неад'емнай часткай. З моманту свайго ўзнікнення ВКЛ сутыкалася з шматлікімі ўнутранымі і знешнімі праблемамі. На працягу XIII–XV стст., у перыяд станаўлення і ўмацавання ВКЛ як дзяржавы, для навядзення парадку ў краіне, падтрымання грамадскага спакою ўжываўся інстытут індывідуальных даручэнняў. Даручэнні такога роду даваліся асобам, прыбліжаным да кіраўніка дзяржавы – вялікага князя літоўскага. Перад ім яны адказвалі асабіста за выкананне дадзеных даручэнняў.

У ВКЛ панавалі феадальныя адносіны. Шляхта лічылася стрыжнем дзяржавы, і дзяржава забяспечвала ахову яе інтарэсаў у першую чаргу, а інтарэсы мяшчан, сялян ахоўваліся ў сувязі з іх падданствам шляхце і дзяржаве.

У сярэдзіне XVI ст. пасля маштабных рэформ у краіне быў створаны адзіны для ўсёй дзяржавы апарат кіравання (функцыйны падзел дзейнасці органаў кіравання адрозніваўся ад сучаснага і дзейнічаў на іншых прынцыпах: адзін орган кіравання адказваў за цэлы комплекс праблем: выканаўчых, судовых, распараджальных, адміністрацыйных, эканамічных і г. д.). Інстытут індывідуальных даручэнняў у якасці сродку забеспячэння правапарадку, рашэння канфліктаў працягваў існаваць. У надзвычайных сітуацыях для рашэння ўнутрыдзяржаўных праблем ужываліся ўзброеныя сілы дзяржавы. Але, у асноўным, дзяржава імкнулася здымаць грамадскую напружанасць мірным шляхам.

Ахова грамадскага правапарадку ў ВКЛ не была сканцэнтравана ў адным органе, а была размеркаваная сярод розных службовых асоб і ўстаноў. За захаваннем парадку ў краіне сачыў манарх – вялікі князь літоўскі, з 1569 г. – кароль польскі і вялікі князь літоўскі. Акрамя гэтага за захаванне парадка адказвалі дзяржаўныя органы кіравання ў асобе ваяводы – у межах ваяводстваў, старасты – у межах паветаў і староstваў, шляхты – у межах сваіх маёнткаў, гарадскіх войтаў – у межах горада, гродскіх і земскіх судоў – у межах паветаў і г. д. У гэтым ім дапамагаў корпус слуг, замацаваных за кожнай з пасад і ўстаноў. Функцыянальныя абавязкі такіх слуг мелі комплексны характар па забеспячэнні жыццядзейнасці гэтых устаноў, і ў кола іх абавязкаў уваходзілі функцыі органаў унутраных спраў. Пэўныя функцыі па падтрыманні правапарадку ўскладваліся і на насельніцтва краіны. Так, усе падданыя дзяржаўных, прыватных уладанняў абавязаны былі абараняць межы ўладанняў, у выпадку неабходнасці ўдзельнічаць у затрыманні злачынцаў і г. д.

У XVI–XVIII стст. у складзе асоб, якія забяспечвалі дзейнасць судоў, існавала пасада вознага. Возны у ВКЛ быў службоўцам земскіх, гродскіх судоў. Ён прызначаўся ваяводам па прапанове шляхты павета і выконваў функцыі судовага прыстава, афіцыйнага сведкі, кур'ера суда і г. д. У абавязкі вознага ўваходзілі як функцыі судовага выканаўца, так і абавязак затрымліваць злачынцаў на месцы злачынства, праводзіць папярэдняе следства, дастаўку затрыманых (канваіраванне) у суд, у пэўным сэнсе ён нагадвае сучаснага ўчастковага інспектара міліцыі. Пасада вознага была ўведзена Статутам ВКЛ 1566 г. [1, с. 99–100].

У кожнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінцы дзяржавы (павеце) было па некалькі возных. Яны дзейнічалі толькі на тэрыторыі таго павета, у які былі прызначаны. На чале ўсіх возных аднаго павета стаяў возны-генерал. На гэтую пасаду па прапанове шляхты павета прызначаў сам манарх. Генерал меў права выконваць функцыі вознага не толькі ў межах свайго павета, але і на тэрыторыі ўсёй дзяржавы. За сваю службу возныя атрымлівалі плату па ўстаноўленых нормах ад асоб, па справах якіх яны дзейнічалі. Закон гарантаваў недатыкальнасць асобы вознага. За знявагу вознага прызначалася двайная навязка (Навязка – грашовы штраф за нанясенне ран, пабояў і г. д.) і 12-тыднёвае турэмнае зняволенне, а за забойства – двайная галаўшчызна (Галаўшчызна – грашовы штраф за забойства, які плаціў вінаваты сваякам забітага.) і смяротнае пакаранне. Але і ад вознага патрабавалася спраўна выконваць свае абавязкі. За недобрасумленнае іх выкананне ці злоўжыванне імі возныя неслі адказнасць, яны караліся «за неправдивое сознанье горлом, а за иншие меншие выступки маеть седеть у везенью на замку… дванадцать недель и шкоду стороне поводовой нагородити за доводом» [2, с. 146–149, 213, 377–378, 402].

Пасада вознага не была чымсьці незвычайным. Аналагічная пасада ўводзілася па земскім прывілеі ад 20 лютага 1387 г., выдадзеным каралём польскім і найвышэйшым князем літоўскім Ягайлам, і ў той час насіла назву «юсціцыарыя» [3, с. 39]. Яе носьбіт адказваў за выкананне судовых пастаноў. У XV – пачатку XVI ст. функцыі адпаведнага ўрадніка па забеспячэнні правапарадку, выкананне судовых пастаноў клалася на віжаў (часам іх яшчэ звалі дзецкімі). Пасады дзецкіх, віжаў захоўваліся і ў XVI–XVIII стст. у межах дзяржаўных і прыватных гаспадарча-адміністрацыйных адзінак (староствах, маёнтках і г. д.). Іх кампетэнцыя была аналагічная возным. Але іх паўнамоцтвы дзейнічалі толькі ў межах тых уладанняў, дзе яны займалі пасаду; на іншыя ўладанні і падданых іншых паноў улада такіх асоб не распаўсюджвалася.

У Оршы, згодна з гарадской уставай 1621 г., слугі, якія падпарадкоўваліся органам гарадскога самакіравання, атрымоўвалі грашовае ўзнагароджанне ў адпаведнасці з выкананым аб'ёмам працы: «от огледаня ранъ и каждое речы, от позву (Позва – пісьмовы выклік у суд, тут – уручэнне позвы пазванай старане), от арешту, от отправы (Атправа – выкананне судовай пастановы), от воланя (Валанне – вызаў бакоў у суд), от потуремного

(Патурэмнае – плата вязня пры выхадзе з турмы) по одному грошу, а зособна потуремного слузе, тому у которого ключъ будет по грошу одному». Пры ўступленні на сваю пасаду гарадскія слугі прымалі прысягу аб належным выкананні сваіх абавязкаў. Пры выкананні сваіх службовых абавязкаў гарадскія слугі знаходзіліся пад асаблівай аховай права: «если бы которого з них на справе его врадовои зневажоно яким колвек способом, або злаяно, збито, зранено, албо и на смерт забито, головщина и навязка совитая. А зособна за голову винъныи горломъ каранъ быти мает, а за раны албо зневажене, албо соромочене – вязенем водлугъ узнаня врадового каранъ быти мает». У той час як простым мяшчанам выплачваліся звычайныя галашчызна и навязка [4]. У сярэдзіне XVII ст. у Нясвіжы было тры гарадскія слугі і адзін падвойскі, якім гарадскія органы самакіравання выплачвалі грашовае ўтрыманне за выкананне абавязкаў і забяспечвалі іх службовай вопраткай (формай) [5].

З XVI ст. на тэрыторыі Беларусі існавала пасада войскага. У кожным павеце было па адным войскім. Носьбіты гэтай пасады вызваляліся ад нясення ваеннай службы, але ўзамен былі абавязаныя падчас усеагульнага воінскага апалчэння – паспалітага рушання, калі шляхцічы адпраўляліся на вайну, апякаць і ахоўваць іх сем'і, сачыць за парадкам у павеце.

Сістэма аховы ў ВКЛ не была нечым нязменным, з цягам часу з узнікненнем неабходнасці вырашэння новых задач яна відазмянялася, у ёй з'яўляліся новыя элементы. Напрыклад, у XVII ст. з'явіўся інстытут пагранічных суддзяў. А ў час рэформаў, ініцыіраваных Чатырохгадовым соймам 1788–1792 гг., была створана камісія паліцыі абодвух народаў (Кароны Польскай і ВКЛ), якая ў 1793 г. была рэарганізавана ў камісію паліцыі Вялікага княства Літоўскага і Каронную камісію паліцыі, якія адказвалі за захаванне парадку, бяспекі, ажыццяўлялі кантроль за дзейнасцю мясцовых органаў улады і г. д.

Акрамя службовых асобаў на тэрыторыі сучаснай Беларусі дзейнічаў цэлы шэраг ваенна-служылых груп насельніцтва, у абавязкі якіх уваходзіла выкананне пэўных функцый, уласцівых для сучасных органаў унутраных спраў. Да такіх груп можна аднесці баяр замкавых, баяр путных, шляхцічаў прыватных уладанняў – зямян, выбранцаў і таму падобных сацыяльных груп. Асаблівасцю іх становішча было тое, што з-за панавання ў краіне феадальных адносін яны знаходзіліся на становішчы слуг, падданых свайго пана. У якасці гаспадара (пана) маглі выступаць дзяржава, свецкія або духоўныя ўладальнікі. Прадстаўнікі ваенна-служылых груп надзяляліся сваім гаспадаром зямельнымі надзеламі, на якіх яны жылі і вялі сваю гаспадарку. Але за карыстанне зямлёй на карысць свайго пана яны павінны былі несці цэлы комплекс павіннасцяў сваёй сацыяльнай групы. Зямля ў дадзеным выпадку выступала ў якасці натуральнага заробку за службу. У мірны час ваенна-служылае насельніцтва выконвала функцыі органаў унутраных спраў у межах гаспадарча-адміністрацыйнай адзінкі: ахоўвалі грамадскі парадак і спакой ва ўладанні, цэласнасць яго межаў, забяспечвалі ахову найважнейшых аб'ектаў і

маёмасці ўладання (замкаў, двароў, казны і г. д.). У ваенны час гэтыя групы насельніцтва выконвалі воінскую службу.

Асобнай ваеннаабавязанай групай насельніцтва былі выбранцы, якія выкарыстоўваліся ў ваенны час у якасці пяхоты. У ВКЛ выбранецкая пяхота з'явілася па рашэнні вальнага сойма 1595 г. Яны маглі звацца гайдукамі, пахолкамі, жаўнерамі (салдатамі). На аналагічным становішчы ў прыватных уладаннях знаходзіліся драгуны. У мірны час фармаванні выбранцаў выкарыстоўваліся як унутраныя замкавыя гарнізоны. Напрыклад, у пачатку XVII ст. яны ахоўвалі Наваградак, Смаленск, Невель і іншыя замкі [6, с. 150].

Выбранцы набіраліся з насельніцтва па вызначанай норме. У дзяржаўных уладаннях з 20 валок выстаўляўся адзін выбранец. Ён павінны быў быць «да бітвы здольным» і, адпраўляючыся на службу, павінен быў мець шаблю, рыдлёўку, матыку, сякеру, мушкет і на вызначаны тэрмін правізію, порах, волава для сябе і свайго ротмістра. Акрамя таго кожныя шэсць выбранцаў павінны былі мець дзве тачкі, пілу, свярдло, два долаты [7]. Выбранцы павінны былі падчас ваеннага паходу забяспечваць ахову абозу і «выконваць уставічна службу» пад начальствам «афіцэраў, капітанаў», якія прызначаліся са шляхты.

У дзяржаўных маёнтках набор у выбранецкія роты быў скасаваны з 1649 г. Але гісторыя выбранцаў у дзяржаўных маёнтках на гэтым не скончылася. Яны прысутнічалі пад назвамі гайдукі, драгуны ў Брэсцкай эканоміі ў 1668, 1692 гг., у Пінскім і Ліпнішскім староствах у пачатку 70-х гг. XVII ст. і выконвалі паліцэйскія функцыі [8; 9; 10].

Выбранцы існавалі і ў прыватных уладаннях. Так, па распараджэнні магната Багуслава Радзівіла ў яго ўладаннях у пачатку XVII ст. з 10 валок выбіралі аднаго выбранца. Прычым гаварылася: «А такога выбіраць, каб быў прыгожы, стройны, рослы і каб меў да службы ахвоту». Набіраліся фізічна моцныя і псіхалагічна падрыхтаваныя асобы. Выбранцаў выбіралі прадстаўнікі магната на сходзе сялян, прыярытэт даваўся здаровым нежанатым хлопцам. За службу ім давалі паўвалокі вольнай ад павіннасцяў зямлі і з панскай казны выдавалі ў месяц па чатыры злотых. За гэта выбранцы самі сабе набывалі амуніцыю і зброю: мушкет і шаблю [6, с. 251]. У Слуцкім маёнтку Радзівілаў выбранцы ў сярэдзіне XVII ст. былі паселеныя асобнымі вёскамі. Яны захаваліся і ў XVIII ст. і выкарыстоўваліся як гарнізон Слуцкай фартэцыі. Існавалі выбранцы і ў іншых прыватных маёнтках, якімі валодалі як Радзівілы, так і іншыя магнаты ВКЛ. Напрыклад, у маёнтку Сапегаў Дуброўна Аршанскага павета ў 1738 г. воласць выстаўляла шэсць пахолкаў і дзесятніка і забяспечвала іх утрыманне для аховы панскай рэзідэнцыі [11, с. 627]. Сустракаюцца выбранцы і ў маёнтках Дзярэўна (1646–1747), Дзяржынск (Койданава) (1620–1669) Менскага павета, Лахва (1672), Мір (1681) Навагрудскага павета, Беліца Лідскага павета (1696), Копысь Аршанскага павета (1744), Давыд-Гарадку Пінскага павета (1760), Ражанах Слонімскага павета (1762) і інш. [12; 13].

Найбольш распаўсюджанай групай ваенных слуг простага саслоўя былі баяры путныя. Яны прысутнічалі на ўсёй тэрыторыі Беларусі ў дзяржаўных і прыватных уладаннях. Сваю назву яны атрымалі з-за свайго абавязку дастаўляць карэспандэнцыю адміністрацыі ўладанняў. Баяры путныя забяспечвалі захаванасць і дастаўку лістоў і з’яўляліся ваеннай сілай, якая выкарыстоўвалася для захавання грамадскага спакою, прадухілення супрацьпраўных дзеянняў у межах уладання. У сярэдзіне XVI ст. з складу путных баяраў была вылучана асобная павіннасная група, за якой замацавалася назва «служкі». Служкі выконвалі кур’ерскія абавязкі па дастаўцы карэспандэнцыі, і за імі замацаваўся абавязак суправаджэння грошаў у дзяржаўную казну – яны выконвалі інкасатарскія абавязкі [14, с. 214]. З цягам часу кур’ерскія і інкасатарскія функцыі путных баяр, служак гублялі сваю першачарговасць і запатрабаванасць і яны адыходзілі на другі план. Тым не менш у канцы XVII–XVIII ст. у ваеннаабавязаных катэгорый насельніцтва ў коле павіннасцяў павялічвалася роля паліцэйскіх функцый. Напрыклад, баяры Камянецкага староства Брэсцкага павета ў XVIII ст. акрамя павіннасці па развозцы лістоў панскай адміністрацыі і суправаджэнні панскіх грузаў на далёкія адлегласці павінны былі праводзіць «экзекуцыі» сярод падданых, якія запазычылі панскаму двару патрабуемы ад іх аб’ём павіннасцяў [15; 16].

На ўсходзе Беларусі ў XVI – першай палове XVIII ст. у дзяржаўных уладаннях існавала асобная ваенізіраваная група насельніцтва пад назвай «баяры гаспадарскія замкавыя», «баяры замкавыя». У склад гэтай групы ўваходзілі як прадстаўнікі шляхецкага саслоўя, так і выхадцы з простага (мяшчанскага і сялянскага) саслоўя. Баяры замкавыя абавязаны былі пастаянна несці ахову замкаў, да якіх яны былі прыпісаны. У выпадку неабходнасці яны прыцягваліся да аховы і навядзення парадку на тэрыторыі ўладання, да дастаўкі канфідэнцыйнай карэспандэнцыі. Баяры замкавыя былі ў Магілёўскай эканоміі, Гомельскім, Рагачоўскім, Чачэрскім, Прапойскім, Крычаўскім, Мсціслаўскім дзяржаўных маёнтках (староствах).

У 1726 г. баяры Чачэрскага староства пражывалі ў 16 вёсках: у Багдановічах, Грамыках, Струмені, Лапічах, Свяцілавічах, Сябровічах і інш. (усяго 144 дамы). Яны выконвалі цэлы шэраг ваенных, гаспадарчых павіннасцяў, сярод якіх была і павіннасць штогод падчас правядзення кірмашоў у Чачэрску з’яўляцца з узбраеннем (па адным пешым ад сяла) у мястэчка і ахоўваць грамадскі правапарадак. У выпадку нападу на староства непрыяцеляў баяры павінны былі з’явіцца ўсе ў поўным узбраенні конна або пешша [17, с. 31–39].

Падобныя павіннасці ў 1742 г. выконвалі стральцы Кобрынскай эканоміі з сяла Шчэрбы (стральцы ў XV–XVIII стст. уяўлялі сабой катэгорыю сялян-слуг, асноўнай павіннасцю якіх была арганізацыя і непасрэдны ўдзел у паляванні). Стральцы гэтага сяла абавязаны былі ахоўваць звярынец, знаходзіцца пад камандаваннем панскага ўрадніка падчас кірмашоў і сачыць за парадкам, а ў выпадку беспарадкаў прысякаць іх. Акрамя таго на гэтых жа асоб ускладалася павіннасць рабіць ружэйны салют у велікодную ноч [18, с.

142]. Шляхта Смаргонскага маёнтка ў другой палове XVIII ст. была абавязана ў час правядзення кірмашу ў Смаргоні выстаўляць 10 узброеных конных зямян для аховы парадку. Такі ж атрад штотыднёва выдзяляўся для нясення аховы маёнтка, зямяне павінны былі па чарзе па адным у параднай амуніцыі конна несці ахову панскай рэзідэнцыі. Акрамя таго два разы на год праводзіўся агульны агляд зямян маёнтка [19, с. 173, 232–233].

Становішча ваенных слуг мела сваю спецыфіку ў розных уладаннях. Напрыклад, у старостве Ліпнішкі ў 1768 г. было некалькі відаў ваенных слуг: баяры, зямяне панцырныя і зямяне путныя. Асноўнай павіннасцю баяраў была кур’ерская служба і суправаджэнне важных грузаў. Зямяне панцырныя павінны былі быць заўсёды гатовымі да абароны меж староства. Для гэтага яны павінны былі мець каня, сядло, мундзір, шаблю, пісталеты і карабін. Зямяне путныя павінны былі мець аналагічнае ўзбраенне. У іх абавязкі ўваходзіла ездзіць па асабліва важных справах у самыя далёкія дарогі. Акрамя таго яны па чарзе неслі ахову панскага двара падчас знаходжання ў старостве правяраючых (камісараў). Яны ж абавязаны былі лавіць і дастаўляць камандаванню дэзерціраў-артылерыстаў [20, с. 96]. Апошняя павіннасць была выклікана тым, што ў 1670 г. Ліпнішкі разам з Гераненамі былі перададзены на ўтрыманне артылерыі Вялікага княства Літоўскага.

Існавалі ўраднікі, якія выконвалі спецыяльныя задачы. Напрыклад, у XVII ст. на памежжы ВКЛ і Расіі былі частыя выпадкі разбойных нападаў на купцоў. Для процідзеяння такім з’явам і вырашэння канфліктных сітуацый на мяжы ВКЛ прызначаўся памежны суддзя са штатам слуг. Памежны суддзя павінен быў затрымоўваць злачынцаў і праводзіць судовы разгляд спраў, перадаваць уладам парушальнікаў правапарадку. У 1686 г. быў заключаны вечны мір паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй. У сувязі з чым з мэтай аператыўнага навядзення парадку ў памежных абласцях і каб «не павялічвалася непрыязнасць паміж манархамі» кароль польскі і вялікі князь літоўскі Ян Сабескі ў 1689 г. выдаў універсал, якім надзяляў памежных суддзяў не толькі правам арышту злачынцаў і здзяйснення над імі суда, але і правам прывядзення прысуду ў выкананне. Як гаворыць дакумент; памежны суддзя меў правы «людзей свавольных, якія займаліся разбоем, наездамі пры мяжы, і якія аб’ядноўваліся ў свавольныя групы (банды), лавіць, судзіць і караць». Акрамя таго гэтым універсалам пагранічным суддзям прадпісвалася правяраць тавары купцоў, якія выязджаюць за мяжу з мэтай недапушчэння вывазу забароненых тавараў, і дазвалялася ўсім, хто выязджаў у Расію і вяртаўся назад ці прыязджаў з Расіі, выдаваць пашпарты на права выезду з ВКЛ і праезду па яе тэрыторыі. У канцы 80-х гг. XVII ст. на ўсходзе Беларусі памежным суддзёй ВКЛ быў шляхціч Юзэф Ладзінскі [21]. Пасля для выканання прысуду памежныя суддзі перадавалі злачынцаў у гродскі суд павета, у межах якога было здзейснена злачынства.

Прыведзеныя дадзеныя сведчаць, што на тэрыторыі Беларусі ў XVI–XVIII стст. існавала своеасаблівая сістэма па захаванні правапарадку ў краіне.

Можна з упэўненасцю сцвярджаць, што службоўцы Беларусі, насельніцтва ва ўсе часы з годнасцю неслі свае абавязкі. І нам ёсць чым ганарыцца і з каго браць прыклад.

Бібліяграфічныя спасылкі


1. Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года. Мінск, 2003.

2. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 : Тэксты. Давед. Камент. / рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : БелСЭ, 1989.

3. Вішнеўскі, А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах : (Са старажытных часоў да нашых дзён) / А.Ф. Вішнеўскі, Я.А. Юхо. Мінск, 2003.

4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Фонд 18. Воп. 1. Спр. 100. Арк. 501.

5. Тамсама. Фонд 694. Воп. 2. Спр. 4963. Арк. 132 адв., 151 адв., 152, 182.

6. Грыцкевіч, А.П. Беларускія выбранцы / А.П. Грыцкевіч // Полымя. 1970. № 11.

7. НГАБ. Фонд 18. Воп. 1. Спр. 579. Арк. 130, 130 адв.

8. Тамсама. Фонд 1928. Воп. 1. Спр. 36. Арк. 80 адв., 37, 47 адв.

9. Тамсама. Спр. 176. Арк. 22 адв., 37.

10. Тамсама. Спр. 158. Арк. 2 адв, 49 адв.

11. Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Мінск, 1936. Т. 1.

12. НГАБ. Фонд 5. Воп. 1. Спр. 188, 736, 738, 743, 746, 1539, 1698, 1700, 1788/1, 2166, 2444.

13. Тамсама. Фонд 1928. Воп. 1. Спр. 209.

14. Белоруссия в эпоху феодализма : сб. док. и материалов : в 3 т. Минск, 1959–1961. Т. 1 : С древнейших времен по середину XVII века. 1959.

15. НГАБ. Фонд 5. Воп. 1. Спр. 1617. Арк. 11.

16. Тамсама. Спр. 1625. Арк. 21.

17. Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской, хранящиеся в Центральном архиве в Витебске / сост. А. Сазонов [и др.]. Витебск, 1900. Вып. 28.

18. Похилевич, Д.Л. Крестьяне Белоруссии и Литвы в XVI–XVIII вв. / Д.Л. Похилевич. Львов : Изд-во Львов. ун-та, 1957.

19. Инвентари магнатских владений Белоруссии XVII–XVIII вв. Владение Сморгонь. Минск, 1977.

20. Похилевич, Д.Л. Крестьяне Белоруссии и Литвы во второй половине XVIII в. / Д.Л. Похилевич. Вильнюс, 1966.

21. НГАБ. Фонд 18. Воп. 1. Спр. 142. Арк. 595–596.